

# Ганаровае месца

***З 27 па 28 кастрычніка 2020 года на стадыёне нашага ўніверсітэта прайшлі спаборніцтвы фінальнага этапу Рэспубліканскай студэнцкай футбальнай лігі 2020 года сярод мужчынскіх каманд. У барацьбу за месца на п'едэстале ўступілі чатыры найлепшыя студэнцкія каманды з БДПУ, БНТУ, БДУФК і МДУХ.***

У першым паўфінальным матчы на поле выйшлі зборныя каманды БДПУ і БДУФК. Перад пачаткам сустрэчы складана было аддаць перавагу адной з каманд, ды і на працягу ўсёй гульні ішла роўная барацьба. Але ўдача ў гэты дзень усміхнулася прадстаўнікам вядучага спартыўнага ўніверсітэта краіны. Паражэнне нашай каманды з лікам 2:4 і толькі суцяшальны матч за 3-е месца.

Лёс другой пуцёўкі ў фінал вызначыўся толькі ў серыі пасляматчавых пенальці, дзе футбалісты з Магілёва аказаліся мацнейшымі за каманду БНТУ. У матчы за 3-е месца сышліся каманды БНТУ і БДПУ. З першых хвілін матча было бачна, што нашы футбалісты хочуць рэабілітавацца і заваяваць бронзавыя медалі. Ужо не было нервовасці, у гульні каманды з'явілася лёгкасць, а выдатная гульня ў абароне і выдатная рэалізацыя сваіх момантаў дазволіла зборнай БДПУ ўпэўнена абыграць саперніка з лікам 7:1.

Калі ўлічваць, што ў мінулым годзе зборная БДПУ заняла 8-е месца ў спаборніцтвах, то "бронзу" ў гэтым годзе можна лічыць вельмі добрым вынікам, хоць і каманда, і трэнерскі штаб, і заўзятары разлічвалі на перамогу ў турніры.

Пераможцай Рэспубліканскай студэнцкай футбольнай лігі 2020 года сярод мужчынскіх каманд стала зборная БДУФК, якая ва ўпартай барацьбе абыграла каманду МДУХ з лікам 3:2.

Акрамя бронзавых медалёў, зборная БДПУ атрымала і асабістую ўзнагароду ад арганізатараў спаборніцтваў: лепшым паўабаронцам турніру быў прызнаны Мікіта Макараў.

**Уладзіслаў ЛЯНІЎКА,**
**прэс-служба БДПУ.**